БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Газета Беларускага дзяржаўнага універсітэта

11 верасня 2003 года, чацвер, № 13 (1878)

СВЯТЫ

Віват, студэнт!

Новы навучальны год у БДУ традыцыйна пачаўся тэатралізаваным шоу для першакурснікаў "Віват, студэнт!", прысвечаным рэспубліканскаму Дню ведаў. Яго адметнасцю сёлета стала месца правядзення — у сталічным парку "Dreamland», чаму спрыяла нават надвор'е. Чатыры тысячы шчасліўчыкаў змаглі пакатацца на атракцыёнах парка і гэтым спатоліць цягу маладосці да экстрэмальнага і рызыкоўнага.

Цырымонія адкрыцця мерапрыемства таксама была відовішчнай і будзіла ўяўленне тых, хто ўпершыню пераступіў парог універсітэта. Гэта шоу шароў і сцягоў усіх факультэтаў ВНУ, выкананне універсітэцкага гімна, клятва першакурсніка, якая суправаджалася палётам галубоў, святочнае з'яўленне верталёта з рэктарам...

У парку працавалі тры пляцоўкі. На адной праходзілі спартыўныя спаборніцтвы (армрэслінг, перацягванне каната і інш.), прадэманстравалі сваё майстэрства ролеры, веласіпедысты, скейтбардысты. На другой дзяўчаты змагаліся за званне каралевы свята.

Эстрадныя калектывы Беларусі і Расіі, сярод якіх былі гурты "Лакі", "Стокс", "Мо дэнс", парадавалі студэнтаў сваімі песнямі. За гадзіну да поўначы неба засвяцілася рознакаляровымі залпамі фінальнага феерверка, які абвяшчаў, што заўтра пачынаецца навучанне.

Ганна АНАТОЛЬЕВА
Фотаздымкі Генадзя КРАСКОЎСКАГА і Яўгена ПАМЫТКІНА

СЛОВА — ПЕРШАКУРСНІКАМ

Першы дзень у БДУ

Сваімі ўражаннямі ад першага дня ва універсітэце, ад свята «Віват, студэнт!» з чытачамі «Беларускага універсітэта» падзяліліся першакурснікі.

***

Мы разумелі, што такое бывае толькі адзін раз у жыцці, і стараліся атрымліваць асалоду ад кожнай хвіліны свята. Сонечнае надвор'е, яркія колеры парка, атракцыёны, выступы нашых эстрадных зорак забяспечылі ўсім самы святочны настрой на ўвесь вечар.

Тамара КУРЧАТАВА

***

Я не магу падабраць словаў, каб выказаць тыя пачуцці, якія перажыла на свяце. Клятва першакурсніка, дэканы ў мантыях, парад сцягоў і шароў, белыя галубы, якія ўзлятаюць у неба, і, нарэшце, прылёт рэктара... У гэты дзень радавала ўсё: зялёная трава, яркае сонца, цёплы ветрык нібы кампенсавалі халоднае лета, праведзенае за падручнікамі і сшыткамі.

Вольга ІГНАЦЬЕВА

***

Пра тое, што ўрачыстая частка ў праграме свята прадугледжваецца, я здагадалася, пабачыўшы "Клятву першакурсніка". Аднак я ніколі не думала, што банальная "лінейка" можа так захапіць, што яна можа быць такой цікавай, што рэктар можа прыляцець на верталёце, як добры чараўнік з дзіцячай песенькі. А галубы, а шарыкі, а парад дэканаў, феерверк, атракцыёны, новыя знаёмствы, "Дыскатэка Аварыя"!..

Любоў ЗАХАРАВА

Клятва першакурсніка

Мы, першакурснікі Беларускага дзяржаўнага універсітэта, уступаючы ў шэрагі студэнцкага брацтва вядучай ВНУ краіны, урачыста клянемся:

прыняць эстафету годнага служэння айчыннай навуцы і культуры на карысць нашай дзяржаве — клянемся;

не шкадуючы сіл спасцігаць назапашаныя чалавецтвам веды — клянемся;

высока несці, захоўваць і множыць слаўныя традыцыі Беларускага дзяржаўнага універсітэта, ва ўсім быць узорам сумленнасці, высакароднасці і працаздольнасці і дысцыпліны, актыўна ўдзельнічаць у грамадскім, навуковым і культурным жыцці роднай alma mater — клянемся;

усю сілу розуму, увесь пал свайго сэрца накіраваць на павышэнне аўтарытэту айчыннай навукі і адукацыі — клянемся;

з гонарам насіць гордае званне студэнта — клянемся;

быць вартымі грамадзянамі Рэспублікі Беларусь —

клянемся! Клянемся! Клянемся!

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

11 верасня 2003 года, чацвер, № 13 (1878)

ВЕДАЙ НАШЫХ!

Чэмпіён свету – студэнт БДУ

На чэмпіянаце свету па лёгкай атлетыцы, які праходзіў у Парыжы, беларуская зборная паказала выдатныя вынікі, заваяваўшы багата медалёў. Пэўны час яна нават трымала першынство, пакінуўшы ззаду зборныя-фаварыты — ЗША, Расію, Францыю, Вялікабрытанію.

У першы ж дзень спаборніцтваў штурхальнік ядра Андрэй Міхневіч, студэнт чацвёртага курса юрыдычнага факультэта БДУ, паслаўшы снарад на 21 м 69 см, атрымаў залаты медаль. Гэта быў асабісты рэкорд А. Міхневіча.

Да Парыжа спартсмен удзельнічаў у двух сусветных чэмпіянатах. Самы высокі паказчык — дзесятае месца на спаборніцтвах у канадскім горадзе Эдмантане 2 гады таму. Для перамогі на сёлетнім чэмпіянаце А. Міхневічу давялося палепшыць свой асабісты рэкорд на 3 см.

Пасля спаборніцтваў у Парыжы студэнт нашага універсітэта паехаў на сусветную Універсіяду ў Тэгу (Паўднёвая Карэя), дзе таксама заваяваў залаты медаль.

ПАДЗЕІ

Адкрыўся ваенны факультэт

На базе ваеннай кафедры нашага універсітэта адкрыўся ваенны факультэт. Навучанне на ім будзе праводзіцца па дзвюх спецыяльнасцях — "маральнае і псіхалагічнае забеспячэнне ваеннай дзейнасці" і "прымяненне падраздзяленняў і эксплуатацыя ўзбраення і сродкаў радыяцыйнай, біялагічнай і хімічнай абароны". На хімфаку і ФФСН ужо цяпер рыхтуюць адпаведна хімікаў-тэхнолагаў і псіхолагаў. Гэтыя спецыяльнасці і стануць асновай для навучання на ваенным факультэце. Падрыхтоўка ваенных хімікаў-эколагаў будзе праводзіцца ў нашай краіне ўпершыню: раней іх рыхтавалі ў Расіі.

Пакуль што на факультэт прымаюць толькі хлопцаў, але не выключана, што праз год тут змогуць навучацца і дзяўчаты. Іх будуць рыхтаваць на вайсковых юрыстаў ці журналістаў.

СУПРАЦОЎНІЦТВА

На форум у Расію

На IX Усерасійскі навукова-прамысловы форум "Расія адзіная", які адбудзецца 10-15 верасня ў Ніжнім Ноўгарадзе, адправяцца больш за 50 навукова-тэхнічных распрацовак БДУ.

Сярод іх шматфункцыянальны вымяральны комплекс "Уніпро", запатрабаваны ў машына- і станкабудаванні, энергетыцы, транспарце. Упершыню ў Расіі фізікі прадставяць ультрагукавы лічыльнік вадкасці і колькасці цеплыні, які вызначае расход аб'ёму і масы ўсялякіх вадкіх рэчываў у тэхналагічных працэсах.

Расійскія рэгіёны, якія пакутуюць ад лясных пажараў, зацікавяць створаныя ў БДУ вогнезасцерагальныя і вогнетушачыя саставы "Тофасіл" і "Метофасіл". Яны прызначаюцца як для лакалізацыі, так і для за мсцерагання ад узгаранняў у лясах, на тарфяніках. Да таго ж, гэтыя саставы высокаэфектыўныя, эканамічныя і не шкодзяць навакольнаму асяроддзю. Увагу нафтавікоў мусіць прыцягнуць мабільны прамысловы комплекс па вытворчасці унікальнага палімернага сарбенту — пенапуруму. Гэты матэрыял дапамагае ліквідаваць разліўы нафты на паверхні вады ці глебы, а таксама змагаецца з цяжкімі і лёгкімі гатункамі паліва, мінеральнымі і раслінными масламі, распушчальнікамі, вуглевадародамі.

Па інфармацыі БЕЛТА

АБ'ЯВЫ

РЭКТАРАТ БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА
аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасад:

ПРАФЕСАРА КАФЕДРЫ гісторыі новага і найноўшага часу;

ДАЦЭНТАЎ КАФЕДРАЎ: этналогіі, музеязнаўства і гісторыі мастацтваў, грамадзянскага права, крымінальнага права, грамадзянскага працэсу і працоўнага права, крыміналістыкі, тэорыі і гісторыі дзяржавы і права;

СТАРШЫХ ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: крыміналістыкі, канстытуцыйнага права, грамадзянскага працэсу і працоўнага права, англійскай мовы і моўнай камунікацыі;

ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: канстытуцыйнага права, крыміналістыкі, крымінальнага права, паліталогіі, англійскай мовы і моўнай камунікацыі.

Тэрмін конкурсу — адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.

Адрас: 220050, г. Мінск, вул. Бабруйская, 5а, Белдзяржуніверсітэт, упраўленне кадраў, тэл. 209-54-36.

ФАКУЛЬТЭТ НЕРУХОМАЙ МАЁМАСЦІ БДУ
аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасад:

ДАЦЭНТАЎ КАФЕДРЫ ацэнкі маёмасці.

Тэрмін конкурсу — 1 месяц з дня апублікавання аб'явы.

Адрас: 220050, г.Мінск, вул. К.Маркса, 31—311, факультэт нерухомай маёмасці БДУ, тэл. 209-58-98.

ПАДВЕДЗЕНЫ ВЫНІКІ

Прыёмная кампанія БДУ – 2003

Скончылася гарачая пара ўступных іспытаў. Студэнтамі Беларускага дзяржаўнага універсітэта сталі 3705 абітурыентаў, з якіх на дзённую форму навучання паступілі 1899 чалавек.

Пра маштабы працы прыёмнай камісіі можна меркаваць па наступных лічбах. Ва універсітэт было пададзена амаль 7500 заяваў. Да правядзення ўсёй уступнай кампаніі было прыцягнута 219 выкладчыкаў БДУ ў складзе 13 экзаменацыйных камісій, 116 студэнтаў — грамадскай прыёмнай камісіяй, сфармаванай упраўленнем выхаваўчай работы з моладдзю. У склад сакратарыята прыёмнай камісіі ўваходзілі 144 выкладчыкі і супрацоўнікі, прадстаўнікі ўсіх факультэтаў універсітэта.

Прыёмная кампанія ў БДУ, як заўжды, была пад пільнай увагай з боку дзяржавы. Разам з выкладчыкамі універсітэта працавалі 12 членаў камісіі па кантролі за ходам падрыхтоўкі і правядзення ўступных іспытаў, якую ўзначальваў памочнік Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, галоўны інспектар па Мінску Д.М. Казакоў. У складзе прадметных камісій працаваў 41 член рэзервовых экзаменацыйных камісій, настаўнікі сярэдніх школаў і выкладчыкі з іншых вышэйшых навучальных установаў.

Асаблівасцямі сёлетняй прыёмнай кампаніі стала адкрыццё новага факультэта, прыём на шэраг спецыяльнасцяў паводле вынікаў цэнтралізаванага тэсціравання, ужыванне новай тэхналогіі ў падрыхтоўцы і афармленні экзаменацыйных лістоў.

Упершыню ў краіне была ўкаранёная сістэма электронай падрыхтоўкі экзаменацыйных лістоў з нанясеннем лічбавых фотаздымкаў абітурыентаў. Гэта дазволіла паскорыць апрацоўку дакументаў, павысіць ступень абароны і максімальна пазбегнуць тэхнічных памылак. Гэтая тэхналогія — адзін з элементаў сістэмы электроннай ідэнтыфікацыі выкладчыкаў, супрацоўнікаў і студэнтаў, якая ўкараняецца сёння ва ўніверсітэце. Гэтым зроблены яшчэ адзін крок да ўвядзення беспаперавай тэхналогіі ў арганізацыі дзейнасці вышэйшых навучальных устаноў, якая цяпер актыўна ўкараняецца ў вядучых ВНУ свету.

Сёлета адбылося нязначнае паніжэнне конкурсу. Гэта тлумачыцца тым, што паралельна з нашым універсітэтам у тыя ж тэрміны праводзілі ўступныя іспыты яшчэ 9 найбуйнейшых ВНУ краіны. Сярод іх вылучаюцца Беларускі нацыянальны тэхнічны універсітэт, Беларускі дзяржаўны медыцынскі універсітэт, Беларускі дзяржаўны універсітэт радыёэлектронікі і інфарматыкі. Таму частка абітурыентаў, якая ў мінулыя гады мела магчымасць спярша паспрабаваць сябе пры паступленні на прыродазнаўчанавуковыя факультэты нашага універсітэта, а потым пры няўдачы паўтарыць спробу ў іншых ВНУ, сёлета мусіла вызначыцца адразу ж на пачатку ліпеня. Варта адзначыць, што сёлета можна было ўдзельнічаць у конкурсе, толькі прад'явіўшы арыгіналы дакументаў аб адукацыі.

Тым не менш, на 11 спецыяльнасцях конкурс вырас у параўнанні з мінулым годам. Самы высокі конкурс склаўся на спецыяльнасці "рамана-германская філалогія": англійская — 10,2, італьянская — 7,2, нямецкая — 6,7 чалавека на месца. Паміж прыродазнаўчанавуковых спецыяльнасцяў самы высокі конкурс быў на спецыяльнасці "геаэкалогія" — 5,27 і на спецыяльнасці біялагічнага факультэта — 3,7 чалавека на месца.

Як і заўжды, высокі конкурс склаўся ў юрыдычным каледжы БДУ, дзе на 100 месцаў прэтэндавалі 593 абітурыенты.

Упершыню ва універсітэце адбыўся набор на ваенны факультэт. 11 чэрвеня 2003 г. у адпаведнасці з Пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь "Аб ваенных факультэтах ва ўстановах адукацыі" ў БДУ быў створаны ваенны факультэт — цэнтр вайсковай падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі. 24 курсанты пасля паспяховай здачы ўступных іспытаў і праходжання збораў прынялі прысягу на вернасць Айчыне і пачалі навучацца па дзвюх спецыяльнасцях — "маральна-псіхалагічнае забеспячэнне ваеннай дзейнасці" і "прымяненне падраздзяленняў і эксплуатацыя ўзбраення і сродкаў радыяцыйнай, хімічнай і біялагічнай абароны".

У параўнанні з мінулымі гадамі знізілася колькасць заяваў, пададзеных медалістамі. Гэта тлумачыцца зменай парадку ўзнагароджання выпускнікоў школаў залатымі і срэбранымі медалямі ды больш жорсткімі патрабаваннямі, якія ставяцца перад тымі, хто ўзнагароджаны медалямі. Усё гэта аб'ектыўна прывяло да скарачэння ліку выпускнікоў-медалістаў. Варта адзначыць, што ўрэшце гэта адбілася і на якасці ведаў, якія прадэманстравала гэтая катэгорыя абітурыентаў. Нездавальняючыя адзнакі атрымалі толькі 22 медалісты, тады як у 2002 г. іх было 138.

З агульнай колькасці 5685 абітурыентаў, якія прымалі ўдзел у конкурсе на дзённую форму навучання, вытрымалі ўсе ўступныя іспыты 4197 чалавек, што складае 74 %. Вынікі някепскія, калі ўлічыць, што ўзровень патрабаванняў прадметных камісій быў вельмі высокі. Так, самыя высокія балы (8, 9, 10) склалі 22 % ад усіх атрыманых адзнак. А нездавальняючыя адзнакі (0, 1, 2) склалі 6,5 %.

У 2003 г. вырас і прахадны бал па многіх спецыяльнасцях. Па 8 спецыяльнасцях прахадны бал пры 4 экзаменах склаў 30 і вышэй: "міжнароднае права", "лінгвакраіназнаўства", "псіхалогія", англійская філалогія", "італьянская філалогія" ды інш. Вырас у параўнанні з леташнім і прахадны бал на фізіка-матэматычныя спецыяльнасці пры адносна невысокім конкурсе. Шмат у чым гэта выклікана высокімі вынікамі цэнтралізаванага тэсціравання. Так, па матэматыцы ў 2002 г. колькасць адзнак 8, 9 і 10 склала 8,8 % ад агульнага ліку атрыманых па матэматыцы адзнак. Сярод жа заяўленых сертыфікатаў доля такіх адзнак склала 41,4 %. Такім чынам, выніковая доля высокіх адзнак па матэматыцы склала 24,2 %.

Высокі ўзровень адзнак цэнтралізаванага тэсціравання па матэматыцы стварыў нясцростую сітуацыю на эканамічным факультэце. На 63 бюджэтныя месцы пасля залічэння без іспытаў пераможцаў алімпіяд 47 медалістаў прадаставілі сертыфікаты цэнтралізаванага тэсціравання з адзнакамі 8 і вышэй. На астатнія 16 месцаў прэтэндавалі 216 чалавек.

Варта адзначыць, што ў адрозненне ад цэнтралізаванага тэсціравання, дзе ўзровень заданняў быў аднолькавы для ўсіх, хто прымаў у ім удзел, у БДУ сёлета, як і заўжды, экзаменацыйныя матэрыялы па ўсіх прадметах фармаваліся па 3 узроўнях складанасці і формах навучання.

Ужо не першы год ідзе дыскусія аб парадку прыёму выпускнікоў вясковых школаў. Не сакрэт, што ўзровень падрыхтоўкі ў вясковай школе значна саступае падрыхтоўцы ў гарадской. Таму каб зраўняць шанцы абітурыентаў пры паступленні, неабходна знайсці аптымальны варыянт сацыяльнай абароны. Так, Тыпавыя правілы Міністэрства адукацыі прадугледжваюць асобны конкурс для гарадскіх і вясковых выпускнікоў. БДУ трымаецца іншага падыходу: выпускнікам вясковых школаў, якія пастаянна пражываюць у вясковай мясцовасці, дадаюцца 3 балы да агульнай сумы балаў, атрыманых на іспытах. Як паказваюць вынікі чатырох апошніх гадоў, гэта дазваляе лепей абараніць інтарэсы вясковай моладзі. Так, у 2003 г. паступілі 197 выпускнікоў вясковых школаў з 588. У выпадку выкарыстання асобнага конкурсу гэтая лічба была б меншай. А на такую спецыяльнасць, як "англійская філалогія", іх магло б быць залічана толькі 2 замест залічаных 5. У параўнанні з мінулымі гадамі вырасла колькасць залічаных абітурыентаў з сельскай мясцовасці: у 2002 г. было залічана 159 чалавек, у 2001 — 156. Пры гэтым доля тых, хто паступіў, ад колькасці ахвотных стаць студэнтамі БДУ сярод жыхароў горада і вёскі аднолькавая і складае 34 % для абедзвюх катэгорый.

Прадметныя камісіі традыцыйна добразычліва ставіліся да абітурыентаў, імкнуліся растлумачыць усе недахопы і памылкі ў адказах. Вынікам такога падыходу стала зніжэнне колькасці апеляцый. У параўнанні з мінулым годам іх лік зменшыўся больш чым у 3 разы. Так, калі ў 2002 г. апеляцый было 36, то ў 2003 г. — 11.

Якасны склад прынятых студэнтаў першага курса дзённай бюджэтнай формы дастаткова высокі. Залічана 357 пераможцаў міжнародных, рэспубліканскіх алімпіяд і алімпіяды "Абітурыент БДУ — 2003", што складае 19 % ад усіх залічаных. Студэнтамі сталі 4 лаўрэаты спецыяльных фондаў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі. 594 чалавекі (32 %) скончылі школу ці сярэднюю спецыяльную навучальную ўстанову з медалём ці дыпломам з адзнакай. Сярод студэнтаў першага курса 844 (45 %) выпускнікі ліцэяў і гімназій, з іх 196 выпускнікоў ліцэя БДУ. Сярэдні бал атэстата залічаных на першы курс складае 8,54. Аднак на шэрагу спецыяльнасцяў гэты паказчык значна вышэйшы. Так, па спецыяльнасцях "лінгвакраіназнаўства", "менеджмент у сферы міжнароднага турызму" (факультэт міжнародных адносін), "фінансы і крэдыт" (эканамічны факультэт) ён склаў 9,1.

Неабходна адзначыць, што падчас сваёй працы прыёмная камісія сутыкнулася і з аб'ектыўнымі цяжкасцямі, звязанымі з познім зацвярджэннем Міністэрствам адукацыі "Тыпавых правілаў прыёму ў вышэйшыя навучальныя ўстановы", у якія быў унесены шэраг зменаў, датычных у тым ліку і пераліку ўступных іспытаў. Нягледзячы на гэтыя складанасці, сістэма давузаўскай адукацыі універсітэта змагла аказаць істотную дапамогу абітурыентам у іх падрыхтоўцы да ўступных іспытаў. У параўнанні з 2002 г. лік абітурыентаў, якія паступілі, прайшоўшы падрыхтоўку на факультэце даўніверсітэцкай адукацыі (падрыхтоўчае аддзяленне і падрыхтоўчыя курсы), вырас больш чым на 20 %.

На дзённую платную форму навучання было залічана больш за 1200 чалавек, што перавышае ўзровень мінулага года. Сярэдні бал атэстата студэнтаў складае 7,9. Неабходна адзначыць, што ў 2003 г. паўтарылі спробу стаць студэнтам бюджэтнай формы больш за 200 студэнтаў-платнікаў, 114 з іх можна павіншаваць з поспехам.

Хочацца спадзявацца, што новае папаўненне студэнтаў БДУ будзе захоўваць і памнажаць традыцыі універсітэта.

В.М. МАЛАФЕЕЎ,
адказны сакратар прыёмнай камісіі БДУ

НОВЫЯ ТЭХНАЛОГІІ

Электронныя студэнцкія білеты

Чуткі аб увядзенні ў БДУ новых студэнцкіх білетаў з'явіліся ўжо даўно. Аднак пакуль яшчэ мала хто ведае, чым адрозніваецца новы варыянт білета ад свайго ўстарэлага папярэдніка, у чым яго перавага і што ён увогуле сабой уяўляе.

Як паведаміў дырэктар Цэнтра інфармацыйных тэхналогій БДУ Ю.І. Варатніцкі, электронны студэнцкі білет — не проста імкненне адпавядаць еўрапейскім стандартам, гэта крок да больш шырокіх магчымасцяў у розных сферах дзейнасці ВНУ. Новы дакумент уяўляе сабой пластыкавую картку стандартнага візітачнага памеру, якая не камечыцца, не рвецца і не намакае, што робіць абыходжанне з ёй вельмі зручным і прыемным нават без уліку яе асноўных функцый.

Апрача сучаснага дызайну новы дакумент мае ўбудаваны мікрачып, які дае магчымасць самому універсітэту спрасціць рашэнне шматлікіх арганізацыйных пытанняў, а таксама прапанаваць студэнту шэраг дадатковых, так званых персаналізаваных, паслуг: доступ у Internet і інфармацыйную сетку ВНУ, электронны фармуляр чытача бібліятэкі, пропуск у інтэрнат. У хуткім часе з'явяцца новыя сервісы: кантроль за наведваннем заняткаў, абхадны ліст. Усё гэта будзе ажыццяўляцца пры дапамозе спецыяльных чытальных прыладаў, выкарыстанне якіх дапаможа выкладчыкам і студэнтам эканоміць каштоўны час.

Таксама мноства станоўчых бакоў мае выкарыстанне тэхналогіі лічбавай фатаграфіі. Па-першае, тым, хто звычайна кепска атрымліваецца на фатаграфіях для дакументаў, яна дазваляе выбраць з некалькіх варыянтаў сваёй выявы найлепшы. Для некаторых студэнтаў, асабліва для дзяўчат, гэты пункт з'яўляецца даволі важным: не па чутках ведаю, як можа сапсаваць настрой штодзённае сузіранне сваёй няўдалай спробы зрабіць "разумны" твар. Па-другое, у выпадку страты электроннага білета яго ўладальніку не давядзецца марнаваць час і грошы на новыя фатаграфіі, бо лічбавае фота студэнта захоўваецца разам з персанальнай інфармацыяй аб яго статусе ў ВНУ ў базе даных студэнтаў, якая знаходзіцца ў распараджэнні дэканата. Патрэцяе, наяўнасць лічбавага фота на новым студэнцкім з'яўляецца абавязковай умовай для набыцця (з адпаведнымі скідкамі) ахвотнікамі студэнцкага білета міжнароднага ўзору ISIC і карты VISA Election. Гэта паслуга, прапанаваная "Прыёрбанкам", дазваляе студэнтам карыстацца шэрагам скідак (напрыклад, на авіябілеты) і нават за мяжой адчуваць сябе досыць надзейна. І апошняе: дзякуючы выкарыстанню лічбавай тэхналогіі электронны білет будзе амаль стопрацэнтна застрахаваны ад падробкі фатаграфіі на ім, што раней спрабавалі практыкаваць найбольш "прасунутыя" студэнты.

Плануецца, што да 15 верасня ўжо ўсе першакурснікі стануць уладальнікамі студэнцкіх білетаў і заліковак новага ўзору. Усяго электронныя білеты атрымаюць каля 17 тысяч студэнтаў БДУ — незвычайна вялікая па маштабах акцыя ўкаранення новых інфармацыйных тэхналогій.

Сняжана ЛІСОЎСКАЯ

Віртуальны універсітэт для рэальных студэнтаў

Ужо год у нашым універсітэце працуе Навукова-метадычны цэнтр "Электронная кніга БДУ". За гэты час яго супрацоўнікі стварылі моцную базу для далейшага развіцця інфармацыйнага адукацыйнага рэсурсу. Асноўныя кірункі дзейнасці Цэнтра — выданне ў электронным выглядзе вучэбных і вучэбна-метадычных матэрыялаў, лекцый; праграмная рэалізацыя тэстаў па праверцы ведаў; тэхнічная падтрымка дыстанцыйнага навучання і інш.

Сёння, калі перадавыя інфармацыйныя тэхналогіі пранікліамаль ва ўсе сферы жыцця чалавека, пытанне пра павышэнне якасці вышэйшай адукацыі пры дапамозе інфарматызацыі навучальнага працэсу з'яўляецца надзвычай актуальным.

Цяпер у Навукова-метадычным цэнтры "Электронная кніга БДУ" распрацоўваецца праект віртуальнай адукацыйнай прасторы універсітэта. Як паведаміў дырэктар НМЦ Ю.В. Пазняк, галоўнай мэтай стварэння канцэпцыі віртуальнага універсітэта з'яўляецца павышэнне якасці ведаў і забеспячэнне дзяржавы спецыялістамі, здольнымі займацца сур'ёзнымі праблемамі на высокім прафесійным узроўні. Для далейшага ўкаранення новых тэхналогій у вучэбны працэс НМЦ прапанаваў сістэму мерапрыемстваў, у якую ўваходзіць стварэнне новых спецыяльнасцяў і спецыялізацый (камп'ютарная біялогія, камп'ютарная хімія), арганізацыя новых курсаў па метадах камп'ютарнай матэматыкі і г.д. Апрача таго, цяпер актыўна вядзецца распрацоўка канцэпцыі афіцыйнага сайту БДУ ў адпаведнасці з сучаснымі патрабаваннямі да яго дызайну, зместу і функцыянальнага напаўнення.

Сняжана ЛІСОЎСКАЯ

АЛІМПІЯДЫ

Усе з медалямі

Усе чатыры ўдзельнікі беларускай зборнай вярнуліся з міжнароднай алімпіяды па інфарматыцы з медалямі. Алімпіяда, у якой бралі ўдзел 265 школьнікаў з 75 краінаў свету, адбывалася ў сярэдзіне жніўня ў Злучаных Штатах Амерыкі. Срэбраны медаль атрымаў самы малады з беларускай зборнай — вучань дзевятага класа Лужаснянскай школы-інтэрната Віцебскай вобласці Уладзімір Керус. Бронзавыя медалі заваявалі выпускнік ліцэя БДУ Сяргей Рогач, адзінаццацікласнік школы № 51 Мінска Максім Восіпаў і дзесяцікласнік педагагічнай гімназіі горада Бярэзіна Павел Сакаў.

"Золата" па біялогіі

На базе БДУ прайшла гэтым летам XIV Міжнародная алімпіяда школьнікаў па біялогіі. Два залатыя медалі атрымалі навучэнцы з Беларусі — Дар'я Канчакова і Сяргей Макеенка. Яшчэ два ўдзельнікі — Сяргей Інфаровіч і Дарына Салуум — былі ўзнагароджаныя срэбранымі медалямі (кожная каманда складалася з 4 чалавек).

Усяго ў алімпіядзе ўдзельнічалі каля 200 чалавек з 41 краіны свету, 17 удзельнікаў атрымалі залатыя медалі. Паспяхова выступілі расіяне: у іх 3 залатыя і 1 срэбраны медаль. Аднак найлепш выступілі прадстаўнікі Азіі: каманды, якія прадстаўлялі Кітай і Тайвань, 4 залатыя, 3 срэбраныя і 1 бронзавы медалі. Таіланд атрымаў 3 залатыя і 1 срэбраны медалі, Сінгапур — 1 залаты і 3 срэбраныя медалі.

Беларусь удзельнічае ў падобных алімпіядах з 1992 г. За гэты час 44 прадстаўнікі нашых школаў і гімназій заваявалі 41 узнагароду (7 залатых, 20 срэбраных і 14 бронзавых медалёў).

Хімікі сустрэліся ў Афінах

У Афінах прайшла XXXV Міжнародная алімпіяда па хіміі сярод школьнікаў. Удзел у ёй узялі 232 школьнікі з 59 краінаў свету. Абсалютным пераможцам стаў дзесяцікласнік з Віцебска Аляксей Путаў. Атрымалі ўзнагароды і навучэнцы ліцэя БДУ: дзесяцікласнік Вячаслаў Бярнат і адзінаццацікласнікі Аляксей Лушчынскі і Аляксандр Жданко прывезлі дадому "срэбра".

АКТУАЛЬНА

Пасяджэнне Вучонага савета БДУ

25 чэрвеня 2003 года прайшло пасяджэнне Вучонага савета БДУ "Аб вучэбнай і навукова-метадычнай дзейнасці кафедраў БДУ па выкананні комплекснай мэтавай праграмы "Развіццё універсітэцкай адукацыі ў 2001-2007 гг."

На пасяджэнні выступіў першы прарэктар БДУ прафесар А.А. Яноўскі. У яго дакладзе былі адзначаны поспехі ў рабоце кафедраў універсітэта па выкананні праграмы развіцця вышэйшай адукацыі: за два гады было распрацавана 2655 новых вучэбных праграмаў, выдадзена 469 вучэбна-метадычных комплексаў, 270 падручнікаў і навучальных дапаможнікаў, 127 курсаў лекцый. У электронным выглядзе падрыхтавана 140 вучэбна-метадычных дапаможнікаў, 118 навучальных дапаможнікаў, 407 курсаў лекцый. Акрамя таго, для арганізацыі цэласнай сістэмы распрацоўкі электронных навучальных матэрыялаў быў створаны Навукова-метадычны цэнтр "Электронная кніга БДУ", які зараз займаецца распрацоўкай праекта віртуальнай адукацыйнай прасторы універсітэта і стварэннем канцэпцыі афіцыйнага сайту БДУ.

На пасяджэнні было адзначана, што тэмпы падрыхтоўкі навучальных матэрыялаў, дапаможнікаў і курсаў лекцый застаюцца невысокімі, што не дазваляе актыўна ўкараняць у навучальны працэс кіруемую самастойную працу студэнтаў.

Вялікую ўвагу надалі члены савета пытанню ўзмацнення кантролю за якасцю вышэйшай адукацыі ў БДУ. На пасяджэнні было падкрэслена, што не ўсе студэнты універсітэта з адказнасцю ставяцца да выканання вучэбных заданняў, сустракаюцца выпадкі несамастойнага выканання лабараторных, курсавых, дыпломных і кантрольных работ. У сувязі з гэтым галоўнаму ўпраўленню вучэбнай і навукова-метадычнай работы сумесна з факультэтамі прапанавана распрацаваць мерапрыемствы, рэалізацыя якіх абавяжа студэнтаў сістэматычна працаваць над вучэбным матэрыялам і самастойна асвойваць новыя веды.

На працягу першага семестра 2003/2004 навучальнага года запланавана правесці растлумачальную работу са студэнтамі аб недапушчальнасці атрымання адзнак падманным шляхам (пры дапамозе спісвання пры правядзенні бягучага кантролю за ведамі, у час залікаў і экзаменаў). Пачынаючы ўжо з другога семестра прымяненне студэнтамі не санкцыянаваных выкладчыкам крыніц інфармацыі будзе разглядацца як грубае парушэнне вучэбнай дысцыпліны, маральных прынцыпаў універсітэта і прыводзіць да аўтаматычнага выключэння з ліку студэнтаў.

Сняжана ЛІСОЎСКАЯ

СЕМІНАРЫ

Павысіць якасць адукацыі

У чэрвені ў памяшканні ліцэя БДУ адбыўся навукова-метадычны семінар, прысвечаны працы універсітэцкіх кафедраў у абнаўленні навучальнага працэсу. У ім прынялі ўдзел выкладчыкі як БДУ, так і іншых ВНУ краіны. Як адзначыў у сваім выступе першы прарэктар нашага універсітэта А.А. Яноўскі, сучасны універсітэт павінен забяспечваць высокую якасць падрыхтоўкі студэнтаў і імкнуцца да запатрабаванасці сваіх выпускнікоў на рынку працы. Менавіта таму ў нашым універсітэце асаблівая ўвага надаецца павышэнню якасці адукацыі. Вырашыць жа гэтую задачу, на думку А.А. Яноўскага, можна, дакладна і рацыянальна арганізаваўшы выкладчыцкую і навукова-даследчыцкую дзейнасць на кафедрах універсітэта. На сёння іх у БДУ налічваецца 178, прычым 155 кафедраў забяспечваюць падрыхтоўку бакалаўраў, спецыялістаў і магістраў.

Разам з семінарам адбылася і тэматычная выстава, прысвечаная дзейнасці універсітэцкіх кафедраў.

Фотаздымак Генадзя КРАСКОЎСКАГА

Лепшыя матэматыкі

Адзін з найлепшых вынікаў паказалі беларускія школьнікі на XLIV Міжнароднай матэматычнай алімпіядзе ў Токіо. Залаты медаль атрымала навучэнка 11 класа ліцэя БДУ Вікторыя Лебедзь. Яе аднакласнік Канстанцін Пашковіч і вучань 10 класа Магілёўскага абласнога ліцэя № 3 Ігар Хрол выйгралі "срэбра". Бронзавымі медалямі былі ўзнагароджаныя вучань 10 класа ліцэя № 1 з Віцебска Станіслаў Архіпаў і навучэнец 10 класа ліцэя БДУ Уладзімір Кокараў.

Сярод пераможцаў — выпускнік ліцэя БДУ

У жніўні на Тайвані прайшла XXXIV Міжнародная алімпіяда школьнікаў па фізіцы. Больш за 200 удзельнікаў з 64 краінаў свету змагаліся за перамогу. Срэбраны медаль заваяваў дзесяцікласнік школы № 51 Аляксандр Міхалычаў, а бронзавы — выпускнік ліцэя БДУ Аляксандр Тарафенка.

Па інфармацыі БЕЛТА

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

11 верасня 2003 года, чацвер, № 13 (1878)

БІРЖА

Студэнты БДУ не застануцца без працы

Ужо амаль год у нашым універсітэце дзейнічае біржа працы для студэнтаў БДУ. Створана яна была Беларускім рэспубліканскім саюзам моладзі пры падтрымцы Мінскага цэнтра занятасці. На сённяшні момант тут прапануюць больш за 200 вакансій па розных спецыяльнасцях.

Сюды прыходзяць пераважна іншагароднія студэнты — народ некапрызны, згодны на любую работу. У цэнтры занятасці юнакам і дзяўчатам дапамагаюць знайсці працу сакратара, гардэробшчыка, грузчыка, хатняй няні... Хлопцы ахвотна працуюць начнымі вартаўнікамі: суткі працуюць, трое — адпачываюць. За гэта атрымліваюць каля 60-70 тысяч рублёў у месяц. Гэтыя грошы для студэнта, тым больш іншагародняга, заўсёды дарэчы. Таксама ёсць магчымасць уладкавацца ахоўнікам на платных аўтастаянках і ў гаражных кааператывах. Зарплата ў ахоўніка большая, чым у вартаўніка, — ад 100 тысяч рублёў. Але самай прэстыжнай (і самай даходнай) з'яўляецца праца рознарабочага на будоўлі. Студэнты занятыя палову дня — з раніцы да абеда альбо з абеда да вечара. За месяц можна атрымаць 150-200 тысяч рублёў.

Папулярнасцю сярод студэнтаў карыстаецца праца афіцыянта і бармена. Зарплата пры гэтым каля 80 тысяч рублёў. Вядома, няшмат, але затое праца не пыльная, пераважна па вечарах, вучыцца не замінае. Да працы дворніка таксама нядрэнна ставяцца. Пагатоў, такіх вакансій шмат. Дый зарплата не самая нізкая — 90-100 тысяч. Вось толькі "танчыць" з мяцёлкай па вуліцах могуць толькі сапраўдныя "жаваронкі", а ніяк не "совы". Таму аматарам паспаць давядзецца пашукаць сабе які-небудзь іншы занятак.

Дзяўчаты нярэдка ўладкоўваюцца прыбіральшчыцамі, прычым заробак непасрэдна залежыць ад месца працы. У тэатры, напрыклад, студэнтка атрымае зусім мала — 20 тысяч. Але ў цырку, дзе прыбіральшчыцы патрэбныя пастаянна, плацяць больш — 55 тысяч. Найбольш выгадна, аднак, працаваць прыбіральшчыцай у рэстаране ці кавярні: праца займае толькі 2 гадзіны ў дзень (зранку ці ўвечары), а заробак складае тысяч 50-80.

Некаторым шчасліўчыкам удаецца ўладкавацца па сваёй будучай прафесіі. Кіраўнік цэнтра занятасці распавёў, што студэнткі педагагічных факультэтаў пераважна працуюць памочнікамі выхавальніка ў дзіцячых садках, зарабляючы 45-60 тысяч рублёў. Гэтую працу будучыя педагогі шануюць: яна і нескладаная, і папрактыкавацца ў занятках з дзецьмі можна. Грошы, вядома, плацяць невялікія, але ж і тыя на дарозе не валяюцца. "У дзіцячыя садкі звычайна запрашаюць не аднаго, а адразу некалькіх памочнікаў выхавальніка, — кажа дырэктар цэнтра занятасці БДУ Аляксандр Лянкевіч. — Таму мы раім дзяўчатам прыходзіць туды не па адной, а парамі. А ўжо з загадчыцай можна будзе дамовіцца, хто будзе працаваць з раніцы, а хто — з абеда."

Будучыя праграмісты таксама нярэдка імкнуцца падпрацоўваць. Добры камп'ютаршчык заўжды запатрабаваны, незалежна ад таго, ёсць у яго дыплом аб вышэйшай адукацыі ці пакуль няма. Цэнтр занятасці ідзе насустрач студэнтам, уладкоўваючы іх у разнастайныя фірмы: там яны зарабляюць прыкладна па 80 тысяч.

Шануюць студэнты і заняткі рэпетытарствам: "падцягваюць" школьнікаў па тым ці іншым прадмеце. На гэтай ніве паспрабавала свае сілы мая сяброўка Света. Летась, навучаючыся на чацвёртым курсе, яна расклеіла на вуліцах абвесткі, што гатовая займацца са школьнікамі нямецкай, беларускай і рускай мовамі. Кліенты знайшліся, і Света год выкладала ў чатырох школьнікаў 5-8 класаў. Свае паслугі яна ацэньвала ў 2 долары за гадзіну — гэтую таксу называюць "студэнцкай".

Студэнт, які працуе, заўжды выклікае павагу. Справай займаецца чалавек, даведваецца, як гэта напраўду — грошы зарабляць. Дарэчы, большасць занятая там, дзе на адсутнасць ці наяўнасць дыплома не глядзяць. Галоўнае, каб праца была з гнуткім графікам і асноўнаму занятку — навучанню — не замінала. Студэнты ВНУ працуюць паўсюдна. І ўмудраюцца зрабіць так, каб і сесіі "хвастатымі" не былі, і працадаўца застаўся задаволеным.

Віталь ЮГАЙ

ВІЗІТЫ

Наш універсітэт наведаў акадэмік С.П. Капіца

17 чэрвеня адбыўся візіт акадэміка Расійскай Акадэміі прыродазнаўчых навук Сяргея Пятровіча Капіцы ў Беларускі дзяржаўны універсітэт. На сустрэчах з рэктаратам і выкладчыкамі БДУ абмяркоўваліся праблемы супрацоўніцтва вядучых універсітэтаў Беларусі і Расіі, абмену інфармацыяй аб нарматыўным забеспячэнні і практычным ажыццяўленні пераходу да шматузроўневай сістэмы падрыхтоўкі спецыялістаў, увядзенні ў вышэйшай школе новых адукацыйных стандартаў, распрацоўцы і выкананні сумесных навукова-даследчых праграмаў. Падчас сустрэчы з рэктарам нашага універсітэта прафесарам А.У. Казуліным расійскі навуковец падкрэсліў неабходнасць каардынацыі дзеянняў і прымянення адзіных падыходаў у галіне рэфармавання сістэмы вышэйшай адукацыі абедзвюх краінаў. С.П. Капіца наведаў фізічны факультэт БДУ, які вельмі даўно і эфектыўна супрацоўнічае з Расійскай акадэміяй навук і універсітэтамі Расіі, найперш — з Маскоўскім дзяржаўным універсітэтам. Акадэмік выказаў зацікаўленасць у выкарыстанні ў расійскіх ВНУ апошняй распрацоўкі супрацоўнікаў факультэта — новага комплекса лабараторных работ для студэнтаў па ўсіх раздзелах курса агульнай фізікі.

У супрацоўнікаў і студэнтаў факультэта размова з буйным навукоўцам, чалавекам шырокай эрудыцыі, вядучым папулярнай тэлеперадачы "Відавочнае — неверагоднае" выклікала вялізны інтарэс.

І.А. САЛАДУХІН,
намеснік дэкана фізічнага факультэта
Фотаздымак Генадзя КРАСКОЎСКАГА

СУСТРЭЧЫ

Памяць сэрца

Пры канцы мінулага навучальнага года на юрыдычным факультэце БДУ па ініцыятыве і пры падтрымцы дэканата, прафбюро, Саюза жанчын адбылася традыцыйная сустрэча і ўшанаванне ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны.

Ветэранаў вайны ўганаравалі студэнты-першакурснікі з аддзялення эканамічнага права, якія падрыхтавалі арыгінальную літаратурна-мастацкую кампазыцыю "Памяць сэрца". У падрыхтоўцы сцэнарыя ўдзельнічалі студэнткі Ганна Ціханская і Алеся Шуцько, вялі праграму Алена Габрыловіч і Віктар Яцкевіч. У выкананні Ігара Вайсмана прагучалі вершы Уладзіміра Высоцкага. Кампазіцыю паводле верша Канстанціна Сіманава паказалі Вольга Сучок і Аляксей Трубінаў. Вершы беларускіх паэтаў, а таксама свае ўласныя чыталі Надзея Лопуць, Алена Бязручка, Яўгенія Казлова. Скончылася вечарына "Лявоніхай" у выкананні Алесі Шуцько, Кацярыны Яўсейкінай, Віталя Кобліка, Мікалая Ліпневіча. Вялікае майстэрства выявілі Марына Камяноўская, Вольга Каробенкава, Ганна Хвашчынская. Ветэраны не хавалі слёзы радасці.

В.С. БРАНАВЕЦ,
дацэнт, старшыня Саюза жанчын юрыдычнага факультэта

МАЙСТРОЎНЯ

Паэзія здайна пачыналася з песень пра каханне. Нездарма адзін з вядомых творцаў сказаў так: паэт датуль паэт, пакуль кахае. З вершаў і рамансаў пра каханне пачынаецца як паэтка і аўтарка гэтай нізкі вершаў Настасся Гарохавік, студэнтка IV курса аддзялення беларускай мовы і літаратуры філалагічнага факультэта.

Алесь БЕЛЬСКІ,
прафесар, лаўрэат Літаратурнай прэміі імя І. Мележа

Настасся ГАРОХАВІК

***

Не шукай і не тэлефануй —
Больш ужо табе не адгукнуся.
Я дарую ўсе твае грахі,
Лепшым станеш, можа, спадзяюся.

Не крыўдуй і вельмі не шкадуй —
Боль пячэ, але затым праходзіць.
Слова раніць, але рэдка ўжо баліць —
Лёс ізноў мяжу сваю праводзіць.

Не трымай, не надакучай —
Нізавошта да цябе я не вярнуся.
Час міне — і раны зажывуць.
Я за гэта кожны дзень малюся.

***

За акном маім асенні вечар,
Лістапад... І сумна ў цішы.
Ты сказаў на развітанне: "Да сустрэчы!"
Зноў адна. Балюча на душы.

Адзінота — гэта вельмі страшна.
Разумею... І хачу спытаць:
"Дзе яно, маё зямное шчасце?"
Хто мне зможа проста адказаць?

Прыйдзе дзень — на гэтае пытанне,
Веру, адшукаю свой адказ.
"Любая!" — пачую на расстанне
І ў царкве пастаўлю свечку я за нас.

Валерий БАЙКЕВ

заместитель декана экономического факультета, профессор кафедры менеджмента, доктор экономических наук

А Я ТАКОЙ НЕСОВРЕМЕННЫЙ...

Стихи, увы, давно не в моде,
И не поют уж серенад
Любимым женщинам в народе,
Как пели много лет назад.

А я, такой несовременный,
Рифмую строки вновь и вновь,
Чтоб подарить Вам часть Вселенной
В десятке сокровенных слов.

Мои стихи — подарок деве,
Чья красота нежна до слез,
Дань венценосной королеве,
Что правит миром дерзких грез...

Быть может, с завистью потомки,
Прочтя их, станут говорить,
Что в предках чувства были тонки
И дам могли боготворить.

НЕСКОЛЬКО СТРОК О БЕЗНАДЁЖНОЙ ЛЮБВИ

Увы... Я Вас не растревожу
И не нарушу Ваш покой.
Пытаюсь Вас забыть.
И всё же...
О Вас я думаю с тоской.
Ни жестом,
ни стихом,
ни взглядом
Не вправе Вам поведать я
О мыслях тех:
быть где-то рядом —
Предел земного для меня!
Я лишь хочу на Вас молиться
И как святыню Вас ценить,
Чтобы смогли Вы насладиться
Талантом женщины пленить.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты – БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ

Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР

11 верасня 2003 года

Падпісана да друку 10.09.2003
Ум. друк. арк. 1
Зак. 960. Тыраж 1000 экз.

Газета зарэгістравана Дзяржаўным камітэтам Рэспублікі Беларусь па друку. Рэгістрацыйнае пасведчанне №149 ад 28 чэрвеня 1996 года.

Распрацоўшчык лагатыпа і дызайну газеты У.У. Васюк

Газета надрукавана ў РУП "Выдавецкі цэнтр БДУ" 220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6

Рэдактар Т.М. КАЗАК

Адрас рэдакцыі: 220050, Мінск, Універсітэцкі гарадок, вул. Бабруйская, 7, паверх 4, пакой 411, тэлефон 209-53-45, e-mail: Gazeta@bsu.by